Источник: **«Звязда» - 2013-02-06**

# Касцюшкі

## Старажытны беларускі шляхецкі род



Касцюшкі — старажытны беларускі шляхецкі род герба "Рох III", вядомы сваімі ўладаннямі на Берасцейшчыне і актыўным удзелам у грамадскім жыцці краю на працягу XVI — XVIII стст. Упершыню прадстаўнікі гэтага роду ўпамінаюцца ў пісьмовых крыніцах XV стагоддзя. Вылучаюцца дзве галіны роду: старэйшая (Іванавічы) і малодшая (Фёдаравічы). Прадстаўнікі галіны Іванавічаў займалі розныя пасады ў перыяд Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай: <I>Ян Касцюшка займаў пасаду войскага чырвонагродскага, у абавязкі якога ўваходзіў нагляд за парадкам у павеце падчас ваенных дзеянняў, асабліва ў той момант, калі шляхта з апалчэннем пакідала свае маёнткі, *Міхаіл Касцюшка*займаў пасаду стольніка оўруцкага (стольнік — ганаровы тытул, што надаваўся знатным феадалам і шляхце), *Антоній Касцюшка* з'яўляўся капітанам войска ВКЛ, *Павел Касцюшка*быў лоўчым — сачыў за берасцейскімі лясамі, у якіх паляваў вялікі князь, распараджаўся паляваннем, *Марцін Касцюшка* займаў прыдворную пасаду крайчага берасцейскага. Сярод прадстаўнікоў галіны Фёдаравічаў былі вядомы *Аляксандр Ян Касцюшка,* падсудак (памочнік земскага суддзі) берасцейскі, *Аўгусцін Касцюшка*, суддзя гродскі троцкі, *Францішак Касцюшка,* скарбнік ваўкавыскі, *Людвік Тадэвуш Касцюшка,*палкоўнік войска ВКЛ, мечнік берасцейскі (у час вялікіх урачыстасцяў мечнік ВКЛ нёс перад манархам аголены меч як сімвал вайсковай улады), *Юзаф Касцюшка,* суддзя Галоўнага трыбунала ВКЛ.

## Тадэвуш Касцюшка — герой двух кантынентаў

Самым вядомым прадстаўніком роду Касцюшкаў з'яўляецца Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка — чалавек-легенда, які на працягу свайго жыцця паспеў пакінуць значны след у гісторыі некалькіх краін, за што па праве лічыцца нацыянальным героем Беларусі, ЗША, Польшчы і ганаровым грамадзянінам Францыі. Нарадзіўся гэты легендарны чалавек у 1746 годзе ў фальварку Мерачоўшчына каля мястэчка Косава Слонімскага павета Навагародскага ваяводства (у цяперашні час гэта тэрыторыя Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці). Спачатку быў ахрышчаны ва ўніяцкай царкве пад іменем Андрэй (у гонар першаапостала Андрэя Першазванага), затым быў перахрышчаны ў касцёле пад іменем Тадэвуш, адсюль і яго двайное імя. У 1755 — 1760 гг. вучыўся ў школе пры Любяшоўскім піярскім манастыры на Піншчыне, дзе актыўна вывучаў французскую, нямецкую, лацінскую, польскую мовы. У 1765 годзе быў прыняты ў адну з найбольш прэстыжных навучальных устаноў таго часу —

Варшаўскую Рыцарскую школу (Кадэцкі корпус), дзе вывучаў геаметрыю, вышэйшую матэматыку, фізіку, палітычную эканомію. Але асноўным прадметам была артылерыя. Па ініцыятыве кіраўніцтва школы, якую ўзначальваў адзін з прадстаўнікоў вядомага княжацкага роду Адам Чартарыйскі, быў накіраваны ў Парыж для вывучэння артылерыі, архітэктуры і фартыфікацыі. У французскай сталіцы Тадэвуш Касцюшка таксама з'яўляўся слухачом Акадэміі жывапісу і скульптуры. Пасля заканчэння навучання, у 1774 годзе, Касцюшка вярнуўся на радзіму. Месца ў арміі Рэчы Паспалітай для высокакваліфікаванага маладога чалавека не знайшлося: афіцэрскую пасаду на той момант можна было толькі купіць за вялікія грошы. Таму Касцюшка вымушаны быў займацца рэпетытарствам: працаваў хатнім настаўнікам у магната Юзафа Сасноўскага. У 1775 годзе зноў выехаў у Францыю, а праз год накіраваўся ў ЗША з мэтай падтрымаць барацьбу паўночнаамерыканскіх штатаў за сваю незалежнасць ад англійскага панавання. У Амерыцы Касцюшка кіраваў інжынернымі работамі па ўзвядзенні крэпасцяў і наладжванні сістэмы ўмацаванняў, якія сталі непрыступнымі для англійскіх каланізатараў. Талент вайскоўца і майстэрства інжынера Касцюшкі былі высока ацэнены першым прэзідэнтам Злучаных Штатаў Амерыкі Джорджам Вашынгтонам. За актыўны ўдзел у бітвах, а таксама за ўдзел у абароне тагачаснай сталіцы ЗША — Філадэльфіі беларускаму шляхціцу было нададзена званне брыгаднага генерала. Касцюшка быў адным з нямногіх афіцэраў-чужынцаў, прынятых у ганаровае таварыства Цынцынанта, якое складалася з самых вядомых удзельнікаў вайны за незалежнасць. У 1784 годзе вярнуўся на Бацькаўшчыну, у свой родавы маёнтак Сяхновічы. Паколькі належнай пасады для яго ў ВКЛ на той час не знайшлося, на працягу пяці гадоў баявы генерал займаўся звычайнымі клопатамі вясковага жыхара. І толькі ў 1789 годзе па рэкамендацыі Брэсцкага сейміка і пры падтрымцы Сейма і караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага Тадэвуш Касцюшка атрымаў пасаду генерал-маёра. Падчас вайны з Расіяй у 1792 годзе асабліва вызначылася дывізія пад камандаваннем Касцюшкі ў бітве пад Дубенкай, а сам камандзір атрымаў чарговае званне генерал-лейтэнанта і ордэн "Віртуці Мілітары". У знак пратэсту супраць змовы караля Аўгуста Панятоўскага Касцюшка падаў у адстаўку і выехаў у Лейпцыг. У гэты ж перыяд пастановай Заканадаўчага сходу Францыі яму было нададзена званне ганаровага грамадзяніна гэтай краіны. Бясконцае ўмяшальніцтва ў справы Рэчы Паспалітай з боку суседніх манархічных дзяржаў выклікалі пратэст у шырокіх слаёў грамадства, і ў першую чаргу, прагрэсіўнай шляхты, перадавыя прадстаўнікі якой рыхтавалі паўстанне. У 1794 годзе ў Кракаве было абвешчана паўстанне. Кіраўніком паўстанцаў стаў Тадэвуш Касцюшка, які заявіў: "Толькі за шляхту ваяваць не буду. Жадаю свабоды для ўсяго народа і толькі для яго гатовы ахвяраваць жыццём!". Касцюшка ўзначальваў абарону Варшавы ад прускіх і расійскіх войскаў. Нават сапернік генерала Касцюшкі, славуты палкаводзец А. Суворaў высока ацаніў яго ваенны талент словамі: "В мятежнике довольно искусства". Аднак у бітве пад Мацяёвіцамі паўстанцы пацярпелі паражэнне, а генерал Касцюшка трапіў у палон і быў зняволены ў Петрапаўлаўскай крэпасці. Пасля смерці Кацярыны II новы расійскі імператар Павел I наведаў Касцюшку і прапанаваў яму амністыю ўзамен на асабістую прысягу імператару. Тадэвуш Касцюшка прыняў гэтую ўмову і разам з тым уручыў Паўлу I спіс паплечнікаў з просьбай вызваліць са зняволення.

Перыяд жыцця Касцюшкі з 1796 па 1798 гады зноў быў звязаны з ЗША. Ад'язджаючы са Злучаных Штатаў Амерыкі, легендарны генерал пакінуў завяшчанне на значную суму сродкаў, ахвяраваных на выкуп рабоў-неграў і іх адукацыю. Затым Тадэвуш Касцюшка доўгі час жыў у Францыі. Там Касцюшка меў сустрэчу з Напалеонам. Французскі імператар прапанаваў баявому генералу прыняць удзел у вайне супраць Расіі, але той адмовіўся, хоць і марыў увесь час аб аднаўленні Рэчы Паспалітай. У адным з лістоў, накіраваных расійскаму імператару Аляксандру, Касцюшка пісаў: "Нарадзіўся я ліцвінам, і мала ўжо застаецца гадоў для жыцця; заслона будучыні закрывае яшчэ

прызначэнне маёй роднай зямлі". Апошнія гады жыцця Тадэвуш Касцюшка правёў у Швейцарыі, дзе і памёр 15 кастрычніка 1817 года. Пасля смерці яго забальзамаванае цела было перапахавана ў Кракаве на Вавелі.

**Памяць пра славутага сына зямлі беларускай**

Памяць Касцюшкі ўшанавана яго нашчадкамі. Так, у Беларусі яго іменем названы плошчы, вуліцы і завулкі ў Косаве, Брэсце, Пінску, Гродне. Імя Касцюшкі мае і адна з вуліц расійскага Санкт-Пецярбурга. У памяць Касцюшкі пад Кракавам насыпаны курган. У ЗША імя Тадэвуша Касцюшкі носіць адна з акруг штата Індыяна, а таксама горад у штаце Місісіпі і востраў у штаце Аляска. Помнікі Касцюшку ўстаноўлены ў вёсцы Малыя Сяхновічы (Жабінкаўскі раён Брэсцкай вобласці), у Кракаве, Лодзі (Польшча), у сямі гарадах ЗША (Вашынгтоне, Бостане, Вест-Пойнце —штат Нью-Ёрк, Філадэльфіі — штат Пенсільванія, Чыкага — штат Ілінойс, Санкт-Петэрсбургу — акруга Пінілас, штат Фларыда, Мілуокі — штат Вісконсін), у Францыі і Швейцарыі. У родным доме ў Марачоўшчыне (Івацэвіцкі раён Брэсцкай вобласці) дзейнічае музей Касцюшкі. Музей Касцюшкі ёсць таксама ў швейцарскім Салюры. Імя Касцюшкі носіць найвышэйшая гара ў Аўстраліі. У гонар Касцюшкі названы самалёт ІЛ-62М авіякампаніі LOT. У Нью-Ёрку (ЗША) у метрапалітэне на лініі метро J ёсць станцыя Kosciuszko Street, названая ў гонар Тадэвуша Касцюшкі.

**Паходжанне роду і прозвішча**

Першым вядомым прадстаўніком роду з'яўляўся Фёдар, у якога быў сын Канстанцін (Касцюшка). Канстанцін у гістарычных дакументах значыцца як дзяк велікакняжацкай канцылярыі. Ён атрымаў у 1509 годзе ад вялікага князя Жыгімонта I Старога маёнтак Сяхновічы непадалёк ад Берасця. Ад назвы маёнтка род часта называлі Касцюшкі-Сяхновіцкія.




Прозвішчы

- ● Касцюшка
- ⊖ Касцюшкін
- ⓞ Касцюшэўскі

Назвы паселішчаў

- ▲ в. Касцюшкава
- ◭ в. Касцюшкавічы
- △ в.Касцюшкі
- ▲ в. Касцюшкі (знікла)

Прозвішча *Касцюшка* паходзіць ад уласнага імя *Касцюшка*, што пацверджана дакументальна. У сваю чаргу, імя *Касцюшка* з'яўляецца беларускім народна-размоўным варыянтам мужчынскага хрысціянскага імені *Канстанцін* (з лацінскай мовы "пастаянны"). Трапіўшы ў беларускамоўнае народнае асяроддзе, кананічнае імя Канстанцін утварыла шэраг варыянтаў: *Канстанчук, Кастко, Кастыка, Кастынюк, Касцючык, Касялей, Касцюшка, Касцян, Касцянка* і інш. Імя*Касцюшка* неаднаразова сустракаецца ў старабеларускіх пісьмовых крыніцах XV—XVIII стст. — у дакументах Метрыкі ВКЛ.

**Сучасныя Касцюшкі**

Прозвішча *Касцюшка* сустракаецца ў многіх раёнах Беларусі: Лунінецкім, Пінскім, Пружанскім раёнах Брэсцкай вобласці; Талачынскім раёне Віцебскай вобласці, Кармянскім, Лоеўскім, Петрыкаўскім раёнах Гомельскай вобласці; Шчучынскім, Ваўкавыскім, Дзятлаўскім, Свіслацкім раёнах Гродзенскай вобласці; Асіповіцкім, Бялыніцкім, Круглянскім, Магілёўскім, Мсціслаўскім раёнах Магілёўскай вобласці; Салігорскім раёне Мінскай вобласці. На Магілёўшчыне (Горацкі, Крычаўскі і Хоцімскі раёны) адзначаецца вытворнае прозвішча *Касцюшкін*, а ў Ашмянскім раёне Гродзенскай вобласці — прозвішча *Касцюшэўскі*. Такая шырокая геаграфія прозвішча абумоўлена ў першую чаргу не менш шырокай геаграфіяй бытавання ў мінулым імя *Касцюшка* ў асяроддзі беларусаў. Неаднаразова фіксуецца гэтае прозвішча і ў нашых суседзяў. Так, толькі ў Маскве ў канцы XX стагоддзя налічвалася больш за

дваццаць сямей з такім прозвішчам. Акрамя Расіі, прозвішча *Касцюшка* адзначаецца ва Украіне (найчасцей у Галіччыне), Літве і Польшчы. Разам з тым, даследчыкамі радаводу Касцюшкаў-Сяхновіцкіх выяўлена повязь гэтага роду з іншымі шляхецкімі родамі: *Ажэшкаў, Багуслаўскіх, Булгарынаў, Бухавецкіх, Вайніловічаў, Вярбіцкіх, Дзянісовічаў, Здзітавецкіх, Міхалоўскіх, Паплаўскіх, Тукальскіх, Яблонскіх* і інш.

На тэрыторыі Беларусі існуюць дзве вёскі, у назвах якіх адлюстравалася імя *Касцюшка*: вёска*Касцюшкава* ў Горацкім раёне Магілёўскай вобласці і вёска *Касцюшкавічы* ў Крычаўскім раёне Магілёўскай вобласці. У мінулым на карце Беларусі былі (у наш час зніклі) дзве аднайменныя вёскі Касцюшкі на тэрыторыі Крычаўскага раёна Магілёўскай вобласці і на тэрыторыі Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці.

**Ігар Капылоў**